Васіль ТКАЧОЎ

# Знаходка



*Гумарэска*

Карэньчыкаў вырашыў змяніць месца працы, бо вельмі яно надакучыла. Некалькі год з ранку да вечара ўкладваў ён новенькія чобаты ў каробкі ды накіроўваў далей па канвееры, дзе іх падхоплівалі іншыя рукі і складвалі ў штабялёк. Нудота, пагадзіцеся? І вось Карэньчыкаў вычытаў, што ў адной саліднай і паважанай арганізацыі патрабуюцца спецыялісты ягонага профілю: укладваць і накіроўваць.

Прыйшоў у аддзел кадраў, прадставіўся і падаў дакументы. Новы начальнік, азнаёміўшыся з імі, змерыў Карэньчыкава з ног да галавы сур'ёзным, прыдзірлівым поглядам і заявіў:

– На вялікі жаль, вы нам не падыходзіце. Біяграфія, прама скажу, кволенькая, нецікавая.

– Ды... ды я... – памкнуўся сказаць нешта Карэньчыкаў.

– Так, і не пярэчце мне, – спыніў яго начальнік. – Усяго адно месца працы? Гэта ж ненармальна! Вы нічым не вылучаецеся сярод астатніх. Шэранькі чалавек. Пачытайце біяграфіі артыстаў або славутых спартсменаў – вось гэта аповед пра жыццё! А ў вас нават няма за што воку зачапіцца.

– Ды... ды я..., – хацеў зноўку нешта сказаць Карэньчыкаў, аднак яму ўсунулі назад у рукі дакументы. Маўляў, забірай, нам такія спецыялісты не патрэбны.

Прыйшоўшы дадому, Карэньчыкаў сеў за стол, цалкам перапісаў сваю біяграфію і на наступны дзень падаў разам з іншымі дакументамі ў іншую арганізацыю. Там начальнік прачытаў яе, расплыўся ў шырокай усмешцы і абвясціў:

– Бяром! Афармляйцеся – і на працу! Вось гэта біяграфія! Шык-бляск! Прыемна чытаць: «Курыць пачаў рана... у першым, здаецца, класе... Былі прыводы ў міліцыю... Уцякаў з урокаў... Ужываў піва... Нюхаў фарбу і ацэтон... Каб не пайшоў у тэатральны гурток, па мне б плакала турма... Працаваў качагарам, вартаўніком, пасвіў кароў, збіраў шклатару, быў кур'ерам...» Гэта ж тое, што трэба. Адразу відаць – цёрты калач! А то адныя сапляі да нас прыходзяць уладкоўвацца! Ні біяграфіі, ні шарму... Ідзіце хутчэй афармляйцеся і заўтра ж выходзьце! Вы наш чалавек! Сапраўдная знаходка!

*г. Гомель.*



Аляксандр КАРШАКЕВІЧ.



Мікола ГІРГЕЛЬ.